ВІНШУЕМ І ЗАКЛІКАЕМ

Вось і адыходзіць у мінулае 1966 год. Для савецкіх людзей гэта быў першы год новай пяцігодкі, год XXIII з'езда КПСС і вялікіх здзяйсненняў на шляху камуністычнага будаўніцтва. Свой пасільны ўклад у творчыя поспехі працоўных нашай краіны ўнеслі і вучоныя, увесь калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна.

У 1966 годзе нашымі вучонымі прадстаўлена на разгляд дванаццаць аўтарскіх вынаходстваў, а з друку вышла звыш 600 навуковых прац. Даследчая работа стала цясней звязвацца з жыццём, з прамысловай і сельскагаспадарчай практыкай. За гэты час абаронена звыш трыццаці доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Універсітэт значна пашырыўся, павялічылася і колькасць студэнтаў.

Партыйны камітэт, рэктарат, мясцком і камітэт камсамола горача віншуюць увесь калектыў універсітэта з дасягнутымі поспехамі ў 1966 годзе і са святам — Новым годам.

Надыходзячы 1967 год будзе для савецкіх людзей, у тым ліку і для калектыва універсітэта, нязвычайным. У шэсцьдзесят сёмым мы адзначым 50-годдзе Савецкай улады. Старанна і натхнёна рыхтуюцца да гэтага свята выкладчыкі і студэнты. Зараз на факультэтах праходзяць партыйныя сходы, на якіх удакладняюцца сацыялістычныя абавязацельствы да юбілею. Толькі выкладчыкі фізфака вырашылі да 50-годдзя Кастрычніка падрыхтаваць пяць доктарскіх і дваццаць пяць кандыдацкіх дысертацый. Шмат новых пунктаў унеслі ў свае абавязацельствы і камуністы іншых факультэтаў.

Горача віншуючы з Новым годам, жадаючы ўсім поспехаў, здароўя, мы разам з тым заклікаем калектыў універсітэта да самаадданай працы на карысць Радзімы з першых дзён 1967 года, каб дастойна сустрэць юбілей Вялікага Кастрычніка.

Т. Я. ДУДАРАВА,
сакратар парткома.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 40 (651) Пятніца, 30 снежня 1966 года Год выдання XX. Цана 2 кап.

КАЛІ РАДАСНА НА ДУШЫ...

Два кароткіх інтэрв'ю нерад Новым годам узяў наш карэспандэнт ў прарэктара па вучэбнай рабоце доктара навук Л. В. Валадзько і ў старшыні мясцкома дацэнта І. Т. Рагоўскага.

Першае пытанне прарэктару:

Адразу пасля свята пачынаецца зімовая сесія, у некаторых студэнтаў яна ўжо пачалася. З якімі поспехамі ў гэтым напрамку сустракае Новы год універсітэт?

Нядаўна вялікая група хімікаў, матэматыкаў і фізікаў закончыла вучобу ва універсітэце. Нас вельмі парадаваў гэты снежаньскі выпуск: выдатныя і добрыя адзнакі атрымала большасць пры абароне дыпломных. Высококваліфікаваных спецыялістаў падрыхтавалі выкладчыкі. Сярод выпускнікоў чатыры прадстаўнікі з В'етнама і адзін з Кубы.

Поўным ходам ідуць залікі на ўсіх факультэтах, а некаторыя курсы ўжо здалі па два-тры экзамены. Іх вынікі сведчаць аб тым, што універсітэцкае студэнцтва ўзяло добры разбег, ёсць упэўненасць у паспяховых выніках сесіі ў цэлым. Жадаю калектыву прафесараў, выкладчыкаў і студэнтаў па-святочнаму сустрэць Новы год, дабіцца новых плённых вынікаў у працы і ў вучобе ў 1967-м!

Якія ўрачыстасці будуць на Новы год ва універсітэце?

На гэтае пытанне адказвае І. Т. Рагоўскі:

Новы год увогуле лічыцца сямейным святам, і яго сустракае кожны па-свойму, але мы паклапаціліся аб тым, каб і універсітэцкая ёлка парадавала дзяцей супрацоўнікаў. Каля тысячы дзяўчынак і хлопчыкаў запрошаны на Новагодні ранішнік. Малышоў сустрэне Дзед Мароз са Снягурачкай. Вясёлыя ігры вакол ёлкі, выступленні дзіцячай самадзейнасці, мультфільмы і іншыя мерапрыемствы прывабяць маленькіх гасцей. Усе яны атрымаюць падарункі і, канешне, добры настрой.

ЗІМОВЫ ДЗЕНЬ

Лена Руцкая

Зімовы дзень, такі прыгожы!
Усё пад сонцам зіхаціць,
І белы іней на бярозе
Пераліваецца, мігціць.

Сняжынкі тысячамі іскраў,
Нібыта зорачкі, гараць,
Прыціх, залёг стары вятрыска,
Спакой не хоча парушаць.

Блішчыць скаваная рачулка,
Застылі вербы над лядком,
Глядзяцца ўніз, нібы ў люстэрка,
Прыцярушыўшыся сняжком.

Скрыпіць сняжок пад палазамі,
Імчыць дарога хутка ўслед,
І застаецца за санямі
Раўнюсенькі, бялюткі след.

Насустрач 50-годдзю Савецкай улады

НАШ УНІВЕРСІТЭТ — У КНІЗЕ

НА ПЕРШЫМ Усесаюзным злёце студэнцкіх будаўнічых атрадаў, які нядаўна адбыўся ў Маскве, наш універсітэт занесены ў Летапіс рэвалюцыйнай баявой і працоўнай славы ЦК ВЛКСМ, якая прысвечана 50-годдзю Савецкай улады. Аб рабоце злёта расказвае студэнт трэцяга курса аддзялення журналістыкі Валодзя Вялічка — дэлегат гэтага форума.

Заснежаныя сцены Крамля. Заглядзеўшыся на салдат, якія крочаць на перазменку ў ганаровы каравул, мы не заўважылі, як апынуліся вакол цалінных сяброў, дэлегатаў Першага Усесаюзнага злёту, бачыць якіх прывыклі ў рабочых спяцоўках, загарэлымі, узмужнелымі.

Вось у адзіным парыве дэлегаты вітаюць авеяныя славай сцягі. У Крамлёўскі Палац з'ездаў урываецца сама гісторыя. Эстафету сцягоў, пачынаючы ад легендарнага крэйсера «Аўрора» і першых пяцігодак, дапаўняюць сцягі студэнцкіх будаўнічых атрадаў. На ўвесь голас словы дыктара:

— Шасцідзесяцітысячны атрад студэнтаў краіны засвоіў 110 мільёнаў рублёў, здаў 250 тысяч квадратных метраў жылля, трыццаць дзіцячых садоў, сорак школ...

Прабягаюць стужкі кіналенты.

Герой Сацыялістычнай Працы, галоўны інжынер будаўніча-мантажнага поезда № 237 дарогі Абакан—Тайшэт Ф. В. Хаданоўскі расказвае:

— Ёсць у моладзі песня, дзе апяваецца подзвіг камсамольца, загінуўшага «на далёкім, на таёжным, на трыццатым кіламетры», фактычна машына правалілася на пяцьдзесят першым. Летам у манумента трактара высадзіліся беларускія «дэсантнікі». Студэнты з Мінска адзін на адзін сталі са сцяной раскіданага сярод топкіх балот лесу. І перамаглі. Восемдзесят кіламетраў стальных нітак перарэзалі тайгу!

Лётчык-касманаўт Павел Беляеў нават пазайздросціў студэнтам:

— Калі чалавек дае паўтары—дзве нормы,—цяпер стала звычайным, калі ж ён пасля дзесяці гадзін на будоўлі выступае з канцэртам,—гэта ўжо нешта новае...

У грамадзе дэлегатаў—камсамолка трыццатых гадоў С. А. Пятрэнка. Шчоўкаюць затворы фотаапаратаў.

— Мяне ад вас,— гаворыць Соф'я Аляксандраўна,— аддзяляе цэлае пакаленне. У свае студэнцкія гады я разам з таварышамі па інстытуту будавала славутую Магнітку. Жылі ў халодных зямлянках, часта галадалі, але малады задор, жаданне верна служыць сваёй Радзіме заўсёды мацней за нягоды і выпрабаванні. У вас, цалінніках, мы бачым дастойную змену...

Гонар за свой першы мазоль, за новыя студэнцкія гарады і сёлы ўсюды суправаджалі дэлегатаў злёту — і тады, калі ішла ўрачыстая частка, і у часы перапынку, і тады, калі разам з М. Крысталінскай, А. Пахмутавай, Э. П'ехай, В. Вуячічам шасцітысячная зала спявала любімую студэнцкую песню «Планета цаліна». А на развітанні мы гаварылі адзін аднаму:

— Да новай сустрэчы, Масква! Добры дзень, цаліна-67!

Ул. ВЯЛІЧКА.

УСЕСАЮЗНАЙ СЛАВЫ



Экзаменацыйны білет... Які ён будзе! Шчаслівы! Студэнтка другога курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Валя Канаплянік задумалася. Ужо не першы раз яна падыходзіць да экзаменатара, але заўсёды хвалюецца. Ды і як не хвалявацца: экзамен — гэта проба сіл.

Фота А. Кадзета.

Не пазнаю цябе, БДУ

Усе ўжо прывыклі да таго, што Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Ул. І. Леніна кожны год робіць вялікі крок уперад у падрыхтоўцы добрых спецыялістаў, у навуковых даследаваннях, у шэфскіх справах, у палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай рабоце. Ведаючы гэта, я не вельмі спяшаўся сюды, калі рабіў свой традыцыйны абход па вышэйшых навучальных установах ордэнаноснага Мінска і адклаў свой візіт на апошнія дні. Але, ведаеце, як глыбока я памыліўся. Мне проста не хапіла часу, каб абыйсці ўсе вучэбныя карпусы, сустрэцца з усімі цікавячымі мяне людзьмі.

У шэсцьдзесят шостым засвяціўся па вечарах агнямі вялікі корпус радыёфізікі і электронікі— за дзень не абыйсці ўсіх яго аўдыторый, кабінетаў, лабараторый. Але гэта яшчэ не ўсё. Узняўся ўверх корпус хімфака, хутка ён таксама гасцінна адчыніць свае шматлікія дзверы. Мне сказалі, што нават такое актыўнае будаўніцтва не задавальняе універсітэт. Толькі за адзін год тут прыбавілася тры новыя аддзяленні, а колькасць студэнтаў павялічылася за кошт першакурснікаў на 2033 чалавекі. Мне пашчасціла моцна паціснуць рукі будучым філосафам, геолагам, эканамістам.

Сустрэўся я і са сваімі старымі знаёмымі — выкладчыкамі У. М. Сікорскім, М. І. Крукоўскім, Л. М. Валадзько, В. А. Платонавым. Як бывала, цёпла віншую дацэнтаў, жадаю ім поспехаў, а хтосьці тузануў мяне за плячо і шапнуў:

— Адстаеш, стары: яны ж ужо даўно дактары навук!

Вось так на кожным кроку я трапляў у крыху недарэчныя абставіны. Ва ўсім вінавата тое новае, якое робіць універсітэт усё больш і больш маладзейшым і прыгажэйшым, нягледзячы на тое, што ён ужо адсвяткаваў свае сорак пяць год жыцця. Што ж, такія змены прыемныя і мне. Ад усёй душы хочацца сардэчна павіншаваць прафесараў, выкладчыкаў, аспірантаў, усіх супрацоўнікаў і студэнтаў з Новым годам. Жадаю вам, дарагія сябры, так хутка крочыць і надалей, жадаю вялікага асабістага шчасця кожнаму!

ДЗЕД МАРОЗ.

ВЫКЛІК ТУРА ХЕЙЕРДАЛА ПРЫНЯТЫ

Зусім нядаўна, 13 снежня — дзень, які па традыцыі некаторыя лічаць нешчаслівым, — для Канстанціна Канстанцінавіча Кудло стаў асабліва знамянальным. Ён паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Хімічны састаў бульбы і цукровых буракоў, вырашчаных на дзярново-падзолістых і тарфяна-балотных глебах».

Доўгім быў шлях да гэтага поспеху. Закончыўшы з дыпломам выдатніка наш гераграфічны факультэт, К. К. Кудло працаваў інжынерам-глебазнаўцам у Інстытуце глебазнаўства Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР. Пасля — аспірантура і напружаная праца па навуковаму даследаванню. Шчыра кажучы, не кожны географ адважыўся б выбраць гэтую тэму.

У даным выпадку не будзе нетактоўнасцю, калі я адкрыю сакрэт Канстанціна Канстанцінавіча: яго натхніў на пераадоленне ўсіх цяжкасцей рэальна існуючы герой — вучоны Тур Хейердал у сваім славутым падарожжы на «Кон-Цікі». Так-так, выклік, кінуты Турам Хейердалам, быў прыняты і Канстанцін Канстанцінавіч паследаваў прыкладу свайго героя ні ў чым не адступаць. Поспех быў дасягнуты. Пажадаем вучонаму ў Новым годзе шчаслівых дарог.

М. ЧАРТКО,
супрацоўнік геолага-геаграфічнага факультэта.



Многія студэнты хімічнага факультэта займаюцца ў навуковых гуртках. Самастойныя даследаванні дапамагаюць ім глыбей засвойваць шматгранны матэрыял, на практыцы авалодваць сваёй спецыяльнасцю.

На здымку: гурткоўцы-чацвертакурснікі (злева направа) Марыя Соркіна, Сяргей Піліпушка і Ларыса Бушуева.

СВЯТА НА ВОСТРАВЕ СВАБОДЫ

Новагоднія ўрачыстасці на Кубе супадаюць са святам Кубінскай рэвалюцыі, якое адзначаецца другога студзеня. Восем гадоў таму назад наш народ пад кіраўніцтвам Фідэля Кастра Рус звергнуў тыранію і стаў на шлях сацыялістычнага будаўніцтва. Нялёгкім аказаўся ён для працоўных—новае ствараецца ў барацьбе з контррэвалюцыяй, з агрэсіўнымі вылазкамі амерыканскіх імперыялістаў.

Мы, кубінскія студэнты БДУ імя Ул. І. Леніна, віншуем усіх выкладчыкаў і савецкіх студэнтаў, усіх нашых сяброў з наступаючым Новым годам і жадаем ім вялікага шчасця, далейшых творчых поспехаў у працы і вучобе.

Няхай жыве кубінска-савецкая дружба!

Барыс Ла СЭРНА,
прэзідэнт зямляцтва кубінскіх студэнтаў.

ЁСЦЬ І Ў НАС ЛАЎРЭАТЫ

Перад Новым годам амаль на працягу цэлага тыдня працягваўся агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў нашага універсітэта. Ён стаў нечарговай вялікага конкурса — Усесаюзнага фестывалю, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады.

У аглядзе прынялі ўдзел харавыя, музычальныя, танцавальныя і эстрадныя калектывы, агітбрыгады, тэатры мініятюр, асобныя дэкламатары. Самы большы поспех выпаў на долю вакалістаў і музыкантаў, якія прайшлі школу нашых вопытных педагогаў М. А. Лісцына, А. І. Білібіна, Ю. М. Жаўрука. Парадавалі сваім выкананнем песень А. Злобіч, Ж. Манастырская, В. Мамінаў, Ф. Ліўшыц і А. Петрыкаў. Зачараваў прысутных вакаліст І. Ражаў. А. Лабковіч, А. Марозаў і М. Бобер задушэўна выканалі на баяне «В путь». З танцораў запамяталіся Ядзя Ліпень і А. Дзегцяроў (выхаванцы Л. К. Алексютовіч), а з дэкламатараў — Л. Кулажанка (яна чытала верш М. Дуксы «Нарач»), Тамара Аўчыннікава («Варварства» Мусы Джаліля), Святлана Дубоўская — урывак з казкі «Прыгоды Бураціна».

Многія студэнты прадставілі да агляду свае вершы (Урванцава, Савіцкі).

Наогул, агляд паказаў узрошае майстэрства самадзейных артыстаў універсітэта, але журы ўлічвала не толькі гэты фактар, але і ўдзел студэнтаў у агульнаўніверсітэцкім калектыве самадзейнасці, у выязных канцэртных брыгад у падшэфныя вайсковыя падраздзяленні, на прадпрыемствы, у калгасы. У выніку — першае месца прысуджана гістарычнаму факультэту, на другім аказаліся філолагі і на трэцім — біёлагі і геолага-геаграфічны факультэт.

У мінулую сераду адбыўся вечар удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, на якім ў святочнай абстаноўцы лепшым выканаўцам — нашым лаўрэатам былі ўручаны граматы і каштоўныя падарункі. Ва універсітэце адбыўся і раённы агляд мастацкай самадзейнасці. Трэба адзначыць, што з кожнага інстытута было прадстаўлена па тры-чатыры нумары, затое нашы «артысты» выступалі на працягу трох гадзін. Сваё ўзросшае майстэрства прадэманстравалі аркестр народных інструментаў, танцавальны ансамбль, эстрадны аркестр. Былі паказаны спартыўныя нумары, і выступілі таксама салісты. Журы падабрала звыш дзесяці нумароў на абласны агляд.

С. А. ЛЫСЕНКА,
дацэнт кафедры рускай літаратуры, член парткома.

На здымках нашага фотакарэспандэнта А. Кадзета вы бачыце: 1. Студэнты геолага-геаграфічнага факультэта Дзіна Сковыш, Валодзя Каральчук і Ядзя Ліпень выконваюць чэшскі народны танец; 2. Выступае эстрадны аркестр пад кіраўніцтвам А. Вайнштэйна; 3. «Вяснушкі» — Э. Лосева, Г. Гаўрыш, Т. Гончар і А. Пескова; 4. Танцавальны ансамбль універсітэта на сваёй сцэне.



З КІМ СУСТРЭЦЦА?

Па ініцыятыве кафедры тэорыі дзяржавы і права сярод студэнтаў першага курса была распаўсюджана анкета, у якой прапаноўвалася адказаць на такое пытанне: «З якімі людзьмі вы пажадалі б сустрэцца?»

Праз некаторы час было атрымана больш за сотню адказаў, з якіх высветлілася, што юрысты маюць вялікае жаданне ўзбагаціць навуковы і культурны светапогляд, больш дазнацца аб людзях сваёй прафесіі.

Вось некаторыя пажаданні: 34 студэнты хацелі б сустрэцца з людзьмі сваёй будучай прафесіі: пракурорамі, следчымі, былымі чэкістамі, работнікамі міліцыі; 30—з пісьменнікамі, паэтамі, артыстамі; 12—з удзельнікамі рэвалюцый, былымі падпольшчыкамі; 9—з касманаўтамі; адзін—з футбалістамі мінскага «Дынама».

Вучоны Савет юрыдычнага факультэта разгледзеў адказы першакурснікаў на анкету і сумесна з партыйным бюро і камітэтам камсамола прыкладае ўсе намаганні, каб выканаць іх запатрабаванні. Так, у самы бліжэйшы час адбудзецца сустрэча са следчым па важнейшых пытаннях пракуратуры БССР М. К. Жаўняровічам. У госці да студэнтаў запрошаны і іншыя супрацоўнікі юстыцыі.

С. ДРАБЯЗКА,
дацэнт.

{«ЮРЫСТ»}

Ці бывае Дзед Мароз у Афрыцы?

У САВЕЦКІМ САЮЗЕ я жыву ўсяго тры гады. Але за гэты час ўжо прывык да прыроды вашай вялікай краіны, палюбіў яе людзей, іх культуру, звычаі. Асабліва мне падабаюцца вашы святы, якія носяць ярка выражаны нацыянальны характар, каларыт. Я некалькі разоў сам прымаў удзел у рускай «Масленіцы», правадах зімы. Акрамя гэтага, часта бачыў у кіно, як умее весяліцца ваш народ.

Больш за ўсё мне запамяталася і спадабалася сустрэча Новага года. Бадай, нідзе так ярка не праяўляецца нацыянальны характар гэтага свята, як тут, у СССР. Яно праходзіць неяк казачна і дзівосна. Я цяпер не магу сабе нават уявіць Новы год без Дзеда Мароза, Снягурачкі, без шумлівага карагоду. А хіба можа што-небудзь замяніць у гэтым святе высокую, стройную і пахучую рускую ёлку?

Але ў розных народаў — розныя звычаі...

У Афрыцы таксама святкуюць Новы год, з якім звязана шмат традыцыйных рытуалаў. Частка іх пасля прыходу каланізатараў паступова знікла. Напрыклад, раней у гонар Новага года ў нас забівалі белага барана і затым спальвалі яго да попелу. А дванаццатай гадзіне ночы ля астанкаў жывёлы пачыналіся масавыя гульні. Людзі каштавалі смачныя стравы, танцавалі і спявалі. І так усю ноч напралёт. Першы дзень Новага года, як і ў вас, лічыўся і зараз лічыцца днём выхадным.

У сучасны момант, калі прыходзіць Новы год, людзі ўпрыгожваюць свае дамы і ўсе грамадскія месцы, вуліцы рознакаляровымі сцяжкамі. Акрамя гэтага, у гарадах для ўпрыгожвання будынкаў выкарыстоўваюць рознакаляровыя лямпачкі. Афрыканцы, як і ўсе іншыя людзі зямнога шара, у навагоднюю ноч доўга не кладуцца спаць. Яна запоўнена песнямі і танцамі. А глыбока апоўначы — традыцыйны фейерверк!

ЛЮДЗІ, якія жывуць у Заходняй частцы афрыканскага кантынента, будуюць дзівосную мадэль карабля. Ён упрыгожваецца рознымі цацкамі з паперы, бамбука і іншых каштоўных матэрыялаў. На караблі ўстаноўліваецца мноства свечак, якія запальваюцца роўна а дванаццатай гадзіне ночы. Святочнаму караблю прысвойваецца імя самага сумленнага і справядлівага па ўсеагульнаму прызнанню жыхара данай мясцовасці. Для кожнага чалавека ў нас гэта лічыцца ганаровым падарункам.

Многія народнасці маёй краіны Кеніі пад Новы год арганізоўваюць асаблівыя ўрачыстасці для дзяцей. Старэйшыя ў сваёй мясцовасці дамаўляюцца паміж сабой аб тым, якія падарункі зрабіць дзецям да свята, што навогул патрэбна, каб святы прайшлі як мага весялей, забаўней, цікавей.

ДЗЕЦІ шумным гуртам носяцца ад хаты да хаты па вёсцы, спяваюць новагоднія песні. І вось на парозе адной хаты з'яўляецца гаспадар у нацыянальным касцюме, віншуе дзяцей са святам, а яны ў сваю чаргу дружна яго вітаюць. Потым гаспадар дому раздае ім падарункі і запрашае дзяцей у свой садзік, дзе іх чакаюць розныя прысмакі.

Вяселле з песнямі і танцамі працягваецца на вуліцы.

Пасля наступлення Новага года задаволеныя малышы разыходзяцца па сваіх хатах і расказваюць бацькам, як яны сустрэлі сваё любімае свята.

Як бачыце, Дзеда Мароза ў нас няма. Дый і запарыўся б ён у Афрыцы ў сваім аўчынным кажуху. Асабліва, калі мець на ўвазе нашы нацыянальныя танцы. Яму ж прышлося б пусціцца ў скокі.

СІМВАЛІЧНА, што Кенія і Савецкі Саюз сустракаюць Новы год адначасова. І хоць ваш час лічыцца па-маскоўску, а ў нас — па-ўсходне-афрыканскаму, але гэта адзін і той-жа час, бо мы знаходзімся на адным мерыдыяне з Масквой.

Няхай наступаючы Новы 1967 год будзе годам вялікага шчасця і новых поспехаў для ўсіх!

Роберт КЕЙГЕ,
студэнт другога курса біяфака.

НА ЗДЫМКУ: Роберт Кейге разам са сваімі савецкімі сябрамі ўпрыгожвае новагоднюю ёлку ва універсітэце.

Гумарэска

ПЕРАВЫХАВАЛІ

Тры гады Міхася скланялі на сходах, пасяджэннях, у дэканатах:

— Гультай, хвасціст, ні аднаго экзамена не можа здаць «з першага заходу». у грамадскай рабоце не ўдзельнічае...

І вось — на чацвертым курсе Міхась стаў выдатнікам. Вестка аб гэтай падзеі маланкай разнеслася па ўсяму універсітэту. У камітэце камсамола адбылося экстранае пасяджэнне. Прамоўцы доўга і з захапленнем гаварылі аб эфектыўнасці іх метадаў выхавання, многа, вельмі многа расчуленых слоў было сказана ў адрас учарашняга хвасціста, а сягоняшняга выдатніка Міхася.

А раніцай студэнты тоўпіліся каля свежага нумару факультэцкай сценгазеты. У цэнтры чатырох склееных ватманскіх лістоў красаваўся партрэт Міхася. Перадавую напісаў сам сакратар камітэта камсамола, выкарыстаўшы знамянальны факт для таго, каб яшчэ раз выказацца аб значэнні выхаваўчай ролі актыва. Пад рубрыкай «З рэдакцыйнай пошты» была надрукавана падборка пісьмаў першакурснікаў, якія кляліся «ісці па прыкладу Міхася».

Гэта быў толькі пачатак. На чарговым сходзе Міхась сядзеў у прэзідыуме, яму першаму далі слова, каб падзяліцца думкай аб сваім вопыце перавыхавання. Прычым, старшыня сходу аб'явіў, што час выступлення Міхася не абмяжоўваецца — пытанне вельмі важнае.

Праз некалькі дзён актывісты іншых факультэтаў запрасілі Міхася на сустрэчы, прысвечаныя падвядзенню вынікаў сесіі. А ў камітэце камсамола стварылі спецыяльную групу па абагульненню вопыта работы Міхася. Неўзабаве была складзена «Памятка актывісту» і размножана на рататары вялікім тыражом — па ліку студэнтаў.

Міхась ледзь паспяваў адказваць на запрашэнні выступіць, расказаць, разам сфатаграфавацца... Сакратар факультэцкага камітэта завёў сабе правіла: кожную раніцу цікавіцца «Што ёсць у адрас Міхася?»

Ужо сталі пагаворваць аб мэтазгоднасці арганізаваць «рух міхасёўцаў», але тут усе карты пераблытаў прафком. Ён таксама не захацеў стаяць у баку ад важнай у жыцці ўсяго калектыва падзеі.

Неяк старшыня прафкома выклікаў да сябе Міхася і, не даўшы яму апамятацца, выдаў яму бясплатную пуцёўку ў дом адпачынку на два тэрміны.

— Так, не на адным энтузіязме!.. Людзей матэрыяльна зацікавіць трэба, — старшыня многазначна падміргнуў. — Ну, усё, жадаю добра адпачыць, паправіцца. Нябось стаміўся?

Надаючы асаблівае значэнне сіле прыкладу, шматтыражная газета тлустым шрыфтам дала паведамленне аб ад'ездзе Міхася на дваццаць чатыры дні ў Крым.

Вяртанне паздаравеўшага, загарэлага Міхася зноў ажывіла да яго цікаўнасць. Дарэчы, на вакзале яго сустракалі з букетамі кветак па два прадстаўнікі ад кожнага курса факультэта. Чаму толькі па два? Вырашылі не ствараць непатрэбнай шуміхі вакол прозвішча Міхася. Яно само за сябе гаворыць.

Адпачыць з дарогі Міхасю не прышлося. Справа ў тым, што праз некалькі гадзін у групе, у якой ён вучыўся, склікалі сход, дзе Міхасю патрэбна было выступіць з новым пачынам — узяць шэфства над пяццю адстаючымі студэнтамі. Пяць — шчаслівы лік!

На гэты раз Міхася не пакінулі без увагі камітэт ДТСААФ, НСО, — большасць грамадскіх арганізацый. У адной ён быў ганаровым членам, у другой лічыўся кансультантам, у трэцяй — няштатным інструктарам. І ўсюды паяўляўся ў прэзідыумах — прышлося завесці запісную кніжку, каб чаго небудзь не ўпусціць.

Праўда, у камітэце факультэта вялі дасканалы ўлік праведзеных і маючых адбыцца з прысутнічаннем Міхася мерапрыемстваў. Аднаго разу сакратар выклікаў Міхася проста з практычных заняткаў:

— Трэба бегчы на злёт маладых перадавікоў раёна. З райкома камсамола пазванілі, што тваё прозвішча першым у спіску лічыцца. Магчыма прыдзецца выступіць...

— Але ж у мяне семінар, — паспрабаваў пярэчыць Міхась.

— Думаю, што такому сумленнаму студэнту, як ты, тлумачэнне не патрэбна, — адпарыраваў сакратар.

Пасля ўсё часцей і часцей выклікалі Міхася з лекцый, практычных заняткаў. Ён засядаў, быў прадстаўніком, дзяліўся вопытам, сустракаўся і сустракаў, вылучаўся і вылучаў...

Кажуць, на яго пачалі звяртаць увагу дзяўчаты. Сам ён гэтага не заўважаў — не было часу. Цяпер Міхась не паспяваў заглянуць у бібліятэку, падрыхтавацца да калоквіума, напісаць курсавую. Міхася як падмянілі. Твар яго асунуўся, чамусьці знікла ўсмешка, якой ён так упрыгожваў прэзідыумы сходаў.

Сябры па пакою ў інтэрнаце расказвалі, што па начах Міхась трызніць, у сне то апладыруе, то прамовы бармоча.

Дзіўны ён нейкі... Днём людзей цураецца, саромеецца сябрам у вочы глядзець...

А аднойчы Міхась моўчкі зайшоў у камітэт факультэта і палажыў на стол пісьмо:

— Вось... Усё!

Сакратар сам сваім вачам не верыў:

«Я, Міхась... патрабую агарадзіць мяне... Я не маю магчымасці займацца — не напісаў ніводнай курсавой, ні разу не выступіў на семінарах на працягу ўсяго семестра. На носе сесія, магу заваліць...»

— Та-а-ак, — забарабаніў па стале пальцам і сакратар, — перавыхавалі-і-і...

Гэта адбылося перад Новым годам. Наперадзе — сесія.

М. РЭГІСТАНАЎ.

ФІЗФАК НАВАГОДНІ
Фота А. КАДЗЕТА.



ФЕЛЬЕТОН

ХВАСТЫ БЫВАЮЦЬ РОЗНЫЯ...

Што такое хвост? Якое яго прызначэнне? Вядома, адкажаце вы, хвост патрэбен аслу, каб адганяць камароў і мух, кату ён замяняе парашут, калі ён каменем ляціць у бездань, а лісе — каб хітра замятаць свае сляды...

А ці бываюць хвасты ў людзей? Гэтае пытанне можа выклікаць толькі смех. Але паслухайце, што сказаў студэнт нашага універсітэта:

— Няма тут нічога дзіўнага, ёсць хвасты і ў людзей, — бажыўся ён, стукаючы сябе кулаком у грудзі...

Мы спрабавалі пярэчыць, але супраць фактаў, як кажуць, не папрэш. Так, сапраўды хвастатыя людзі сустракаюцца і найбольш за ўсё сярод студэнтаў. Мы не ведаем, ці адганяюць яны імі, падобна жывёле, мух і камароў, ці замятаюць свае сляды, але некаторыя з іх ходзяць з хвастамі не тое, каб, скажам, адзін ці два сяместры, а сем-восем і нават на працягу ўсёй вучобы. І хвасты так прыстаюць да іх, што яны з поспехам адмахваюцца імі ад дэканатаў, камітэтаў камсамола, ад сатырычных факультэцкіх газет. Хвасты зусім не перашкаджаюць жыць ім у інтэрнатах разам з «бясхвостымі» і нават даюць магчымасць сяды-тады мацаць у кішэні хрусткія рублікі са стыпендыі.

Праўда, часам над хвасцістамі навісае небяспека: на іх «уздзейнічаюць», «робяць уплыў», «прапясочваюць», адным словам, праводзяць над імі разнастайныя сеансы маральнага лячэння. А вынік?

Вынікаў для сябе ніхто ніякіх не робіць, ды і навошта іх рабіць, калі пасля ўколаў, прыпарак і гарчычнікаў чалавек становіцца здаровым, і, больш таго, у яго выпрацоўваецца пэўны імунітэт супраць «уплыву» грамадскіх арганізацый. Аб гэтым сведчаць факты. Філалагічны факультэт, як самы лягчэйшы на думку студэнта-фізіка, і фізічны, як самы цяжэйшы на думку філолага, маюць аднолькавую колькасць хвасцістаў. На фізфаку — 30, на філфаку — 28. Гэтыя лічбы абвяргаюць памылковае ўяўленне некаторых студэнтаў аб простых і складаных навуках.

Не трэба быць асабліва назіральным чалавекам, каб адкрыць адну ісціну: імёны ў вялікім спісу універсітэцкіх хвасцістаў паўтараюцца адны і тыя ж з сяместра ў сяместр, з курса на курс, з году ў год.

Больш таго, тут ёсць, як кажуць, свае чэмпіёны, сярод якіх Н. Матусевіч, Е. Сушко (IV курс філфака), А. Пракапчук, В. Дзербак (III курс фізфака) і іншыя.

Невядома, як жывецца гэтым хвасцістам, але нам хочацца расказаць пра аднаго з іх папярэднікаў.

Жыў-быў, лепш сказаць, існаваў на філалагічным факультэце Кастусь Мохар. Іменна існаваў. Ён прыходзіў на лекцыі (калі на адну, калі на дзве, а калі і на палову), сядзеў, марнеў і аб чымсьці думаў. Быў Кастусь і камсамольцам, але філфак не памятае, каб ён выканаў хоць адно грамадскае даручэнне. Ён атрымліваў сістэматычна двойкі і несістэматычна — стыпендыю. Яго перавыхоўвалі ў групе, у дэканаце, ў камітэце камсамола. Кастусь лупіў сябе кулаком у грудзі, абяцаў выправіцца, але тут жа забываў пра сваё абяцанне. Дацягнулі, такім чынам, Кастуся да трэцяга курса аддзялення журналістыкі. Нарэшце нехта з вынаходлівых студэнтаў-актывістаў прышоў да думкі:

— Дакуль мы будзем няньчыць Мохара? Няхай папрацуе хлопец, жыццё паглядзіць.

— Геніяльна! — згадзіліся ў дэканаце.

Так Кастусь аказаўся за сценамі універсітэта.

А вось чаму да сённяшняга дня знаходзяцца ў асяроддзі студэнтаў іншыя штатныя хвасцісты? Невядома. Ці не час паступіць з імі так, як з Мохарам?!

Шкада толькі, што прырода такая добразычлівая. А як было б добра, каб у двоечнікаў выраслі сапраўдныя хвасты і ўсе змаглі ўбачыць, якія гэта абібокі і гультаі.

В. ПОЛЯК.

НАПЯРЭДАДНІ

● *За тыдзень да Новага года на філалагічным факультэце адбыўся «апошні» званок. Першакурснікі прынялі ад выпускнікоў эстафету добрых спраў і далі слова памнажаць выдатныя традыцыі факультэта.*

● *Уручаны дыпломы аб заканчэнні універсітэта снежаньскаму выпуску хімікаў і матэматыкаў.*

● *Вялікая група выкладчыкаў гістарычнага факультэта начале з дэканам П. З. Савачкіным наведала Дом адпачынку Саюза пісьменнікаў БССР у Каралішчавічах, дзе ў 1950—1955 гадах жыў і працаваў Якуб Колас. Гісторыкі зрабілі прагулку на лыжах па коласаўскіх мясцінах.*

Іван БАКУНОЎ,
студэнт юрфака

Пераднавагоднія дыялагі

СУСТРЭЧА Ў ТРАМВАІ

СТУДЭНТКА: Вы на наступнай выходзіце?
СТУДЭНТ: А вам хочацца, каб я там вышаў?
СТУДЭНТКА: Для мяне гэта ўсё роўна!
СТУДЭНТ: Дык навошта ж вы тады пытаеце!

СЕМІНАР НА БІЯФАКУ

ПРАФЕСАР: Як адрозніць зайца ад зайцыхі!
СТУДЭНТ: Вельмі проста: па скачках.
ПРАФЕСАР: Як гэта па скачках!
СТУДЭЕНТ: А так. Калі ён скача, дык гэта заяц, а калі яна скача, дык гэта зайчыха.

ПА ДАРОЗЕ ДА БАЦЬКОЎ

На вакзале група студэнтаў-гуманітарнікаў вырашыла пажартаваць над сваім калегам з ветэрынарнага інстытута.

— Скажыце, вы — будучы скацінны доктар?
— Так-так, а што ў вас баліць?

ЭКЗАМЕН НА ЮРФАКУ

ПРАФЕСАР: Вы можаце мне прывесці прыклад, што разумеецца пад махлярствам!
СТУДЭНТ: Магу. Вось, калі вы праваліце мяне — гэта будзе махлярства.
ПРАФЕСАР: А як вы гэта дакажаце!
СТУДЭНТ: У крымінальным кодэксе гаворыцца, што абвінавачванне ў махлярстве выносіцца асобам, якія карыстаюцца неасведамленнем другой асобы, каб нанесці яму шкоду.

НА МЕДПУНКЦЕ

Дзяжурная сястра запаўняе гісторыю хваробы грамадзяніна з перабінтаванай галавой і сіняком пад вачыма:
— Вы жанаты!
— Што вы! Што вы!.. Я студэнт, паслізнуўся на лесвіцы.

Рэдактар М. І. ЮСЬКА.

АТ 08993 Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1730.